**Храпавіцкая, Н.** У вогненных гарах / Н. Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2020. — 29 мая. — С. 4.

# У ВОГНЕННЫХ ГАРАХ

## Пагранічнік Аляксандр Канопка праходзіў тэрміновую службу ў Афганістане

**Дзяцінства і вучоба**

З маім суразмоўцам сустрэлася з задавальненнем, бо завочна яго ўжо ведала. Аляксандр Канопка нарадзіўся ў Рызе, але яго дзяцінства прайшло ў вёсцы Весялова Валосавіцкага сельсавета. Гэты населены пункт і для мяне вельмі дарагі, бо там заўсёды праходзілі мае канікулы.

Выхоўваўся Аляксандр Аляксандравіч у інтэлігентнай сям'і. Маці, Марыя Фёдараўна, доўгі час настаўнічала ў Нававалосавіцкай сярэдняй школе, выкладала рускую мову і літаратуру. Бацька таксама па адукацыі педагог, вучыў дзяцей фізіцы і матэматыцы.

У Весялоўскай сярэдняй школе хлопец скончыў дзевяць класаў, апошні ж год вучыўся ў суседняй, Нававалосавіцкай – гэта якраз быў першы выпуск школы.

Пра дзяцінства і юнацтва мой суразмоўца кажа лёгка і нават жартуе. Гэта і зразумела: вырас у жывапісных лясных мясцінах.

Пяць хвілін пешшу па пяску, як па пляжы, – і ты ў лесе. Так можа ў некалькіх словах апісаць цудоўную вёску любое дзіця, што там праводзіла час. Памятаю, як мы без бацькоў хадзілі збіраць лясныя дары і не баяліся сустрэць звяроў, ведалі, у якой сажалцы лепш купацца, а за якую маглі «атрымаць» ад бабулі. Асабліва любілі падлеткамі даследаваць на той час ужо закрытую школу. У будынку ўстановы можна было знайсці яшчэ шмат цікавага.

Калі з Аляксандрам Аляксандравічам пачалі гутарку пра дзяцінства, у самой з'явілася шмат яркіх успамінаў пра бесклапотны час.

Бацькі майго суразмоўцы трымалі на падвор'і дзве каровы, свіней, курэй, таму працы хлопчык не баяўся. Асабліва ён любіў коней. З гэтай нагоды часта наведваў канюшню, дзе за невялікую дапамогу хлопчыку дазвалялі на любімай жывёле праехаць верхам.

Пасля заканчэння Новалукомльскага прафтэхвучылішча па спецыяльнасці «Электразваршчык», адзінаццатага лістапада 1986 года Аляксандр быў прызваны Чашніцкім райваенкаматам ва Узброеныя Сілы СССР. На той час малады чалавек яшчэ не ведаў, куды яго накіруюць, дзе праявяцца яго мужнасць і адвага.

– Спачатку нам паведамілі, што будзем служыць на Чорным моры, але мы праехалі яго на другія суткі і нават не спыніліся.

**На афганскай зямлі**

Першыя тры месяцы Аляксандр праходзіў службу ў вучэбным падраздзяленні 81-га пагранічнага атрада в/ч 2099 у горадзе Тэрмез Афганскай рэспублікі. Набыўшы там ваенную прафесію кіроўцы, быў адпраўлены ў аўтароту таго ж пагранічнага атрада. У асноўным служба праходзіла за рулём аўтамабіля. Амаль паўтара года Аляксандр быў кіроўцам у начальніка тылу на УАЗ-469, потым дастаўляў лётчыкаў у аэрапорт, на баявыя вылеты на аўтамабілі ЗІЛ-130. У званні сяржанта вярнуўся дадому.

Перыядычна выконваў заданні камандавання на тэрыторыі Афганістана са студзеня 1987 па люты 1989 года.

Наконт сяброўства або, як прынята казаць, баявога братэрства ў мужчын гутарка адмысловая...

– Як сустрэўся з хлопцамі Сяргеем Якутам з Лепеля, Паўлам Васільевым і Яўгенам Шамшуром з Віцебска, так з імі потым і служыў. А ўвогуле з Віцебска ехала група прыкладна з 60 чалавек, практычна з усіх яе ўдзельнікаў потым і стварылі заставу. Хлопцы пасябравалі з першых дзён службы і да канца падтрымлівалі адзін аднаго, калі каму была патрэбна дапамога.

За добрасумленную службу на афганскай зямлі Аляксандр Аляксандравіч узнагароджаны нагруднымі знакамі «Выдатнік пагранвойскаў» I і II ступеняў.



**Аляксандр Канопка** (крайні справа) **з баявымі таварышамі**. Фота з сямейнага архіва

**Пасля дэмабілізацыі**

У 1989 годзе восенню Аляксандр ажаніўся з дзяўчынай з Сітнікаў. Праз год у маладой сям'і з'явіўся на свет сын Яўген. Першая сустрэча мужа і жонкі адбылася ў школе… Ганна Рыгораўна працавала ў Валосавіцкай СШ настаўніцай і нават выкладала матэматыку ў Аляксандра. Запрыкмеціў яе малады хлопец адразу, толькі адчуваў, што прыгожая дзяўчына на яго і не пазірае. А вось калі ўжо служыў у войску, пачаў ёй дасылаць лісты з далёкай афганскай зямлі.

Маладая сям'я пераехала ў аграгарадок Стаі, і адразу ў яе з'явілася немалая гаспадарка. Аднак у 2013 годзе давялося збыць жывёлу, пра што муж і жонка не шкадуюць.

На прысядзібным надзеле ў Канопкаў шмат рознай гародніны, якая без добрага догляду не дасць вялікага ўраджаю. Акрамя гэтага, разам з сынам распачалі добраўпарадкаванне дваровай тэрыторыі – на гэта таксама патрэбен час.

Працаваў Аляксандр Аляксандравіч на розных прадпрыемствах Лепеля, але большасць часу, з 1995 па 2013 год, рупіўся байцом Лепельскага РАНС. Зараз мой суразмоўца з'яўляецца кіроўцам у ДЭУ-37.



**Аляксандр перад выездам у рэйс**. Фота аўтара

Не змаглі ў размове абмінуць тэму, якая вельмі важная для мужчыны, – подзвігі дзеда **Дамініка Канопкі**, які жыў недалёка ад Велеўшчыны, на хутары Калавур. Дамінік Вікенцьевіч – вядомая асоба на Лепельшчыне, поўны Георгіеўскі кавалер. Гэтага звання ён быў удастоены за подзвігі, праяўленыя ў гады Першай сусветнай вайны. Аднак на гэтую тэму вырашылі пагутарыць асобна.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Дзень пагранічных войскаў штогод адзначаецца 28 мая, з 1958 года, і быў усталяваны ў сувязі з тым, што менавіта ў гэты дзень у 1918 годзе Дэкрэтам Савета народных камісараў была заснавана Пагранічная ахова мяжы РСФСР.

***

Давялося сустрэцца напярэдадні свята з **Сяргеем Крывялём**, старшынёй раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», які адзначыў, што сярод членаў грамадскага аб'яднання нямала хлопцаў-пагранічнікаў.

– Хочацца пажадаць усім мужчынам, якія служылі і служаць у гэтых войсках, смеласці і сілы духу, моцнага здароўя і настрою. Няхай іх кожны дзень напаўняецца мужнасцю і гераізмам, – кажа Сяргей Мікалаевіч.

**Наталля ХРАПАВІЦКАЯ**